УДК 902/904(476)+94(38)

# ПЕРЫЯДЫ РЫМСКАЙ ФІНАНСАВА-ПАЛІТЫЧНАЙ ГІСТОРЫІ І ФІКСАЦЫЯ ІХ УПЛЫВУ НА ТЭРЫТОРЫЮ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

**Барнюк А. С.**
Беларускі дзяржаўны універсітэт
(г. Мінск, Беларусь)
Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Тарканеўскі А. А.

Анатацыя. Гісторыя Рымскай імперыі на працягу I–V стст. н. э. мела значны ўплыў на развіццё варварскіх культур на тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы таго ж перыяду. Дадзенае падцвярджаецца археалагічнымі знаходкамі, у прыватнасці нумізматычнымі матэрыяламі. Вылучаецца чатыры перыяды рымскай гісторыі, якія характарызуюцца павелічэннем колькасці знаходак на варварскіх тэррыторыях.

Ключавыя словы: манеты, гандаль.

Summary. The history of the Roman Empire during the I-V centuries AD has a significant imprint on the development of the barbarian cultures in Central and Eastern Europe in the same period. This is confirmed by findings of material, in particular numismatical. It provided a number of periods of Roman history, characterized by peaks in the number of discoveries in the barbarian territories.

Keywords: coins, trade.

Гісторыя Рымскай імперыі характарызуецца як перыядамі заняпадаў, так і перыядамі буйнога ўздыму. Але наколькі гэта ўплывала на іншыя тэрыторыі Еўропы? Як магчыма прасачыць гэты ўплыў? Лепш за ўсё гэта прасачыць па нумізматычных крыніцах.

Першыя асобнікі імперскіх манет сталі з'яўляцца на тэрыторыях Усходняй Еўропы ў I–II стст. Гэта перыяд росквіту рымскай эканомікі і шырокіх заваёў. Гэта ўсё павялічвала даход Рымскай дзяржавы. Менавіта ў гэты перыяд склаўся Бурштыновы шлях. Гэтая дарога пачыналася з Італіі, праходзіла ў рэгіёне Дуная і Мараўскіх Варот, Сілезіі, Вялікапольшчы да Усходняга Памор'я [1, с. 5], была закладзена гандлярамі яшчэ ў часы кіравання Нерона (54-68 гг.). Але ў канцы яго кіравання імперыю спасціг грашовы крызіс, а грамадзянская вайна (68–69 гг.) разбурыла фінансы канчаткова.

Другое павелічэнне патоку манет можа быць датавана часамі кіравання Веспасіяна (69–79 гг.). Веспасіян прывёў у парадак грашовую сістэму, аднавіў фінансавую магутнасць дзяржавы, працягнуў пашырэнне межаў імперыі. Кіраванне яго і бліжэйшых пераемнікаў добра адсочваецца, таму што іх манета з'яўляецца больш якаснай і мае большую масу, як сведчаць скарбы і асобныя знаходкі [2].

Трэці наплыў прытоку грошай, аднак, узыходзіць да рымскага перыяду кіравання "добрых імператараў". З'яўляюцца скарбы манет, якія змяшчаюць манеты Нервы, Траяна, Адрыяна, Антаніна Пія, Марка Аўрэлія ("пяць добрых імператараў") [4, с. 116]. Прычынай рэзкага павелічэння колькасці рымскіх манет у землях Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, было дзве з'явы: развіццё плямёнаў, якія пражывалі на тэрыторыі сённяшняй Польшчы, Украіны, Беларусі і іншых краін, і эканамічныя і палітычныя змены ў Імперыі, якія атрымалі свой апагей. Рымская імперыя дасягнула сваіх максімальных межаў, яе фінансы значна пераўзыйшлі тыя, што былі пры ранейшых кіраўніках.

Толькі новая вайна Марка Аўрэлія з маркаманамі і вялікая эпідэмія "чумы" прывяла да павольнага пагаршэння эканамічнага становішча Імперыі і паслаблення прытоку манет, якія страцілі сваю каштоўнасць у вачах гандляроў з поўначы [5, с. 154]. Але гэта быў доўгі працэс, які канчаецца толькі пасля праўлення яго наступніка – Камода.

Тармажэнне прытоку грошай было відавочна звязана з унутранымі праблемамі і пагаршэннем сітуацыі ў Імперыі, вядомым як "крызіс трэцяга веку". Апагеем грашовага краху, перыядам бесперапыннага "псавання" манеты стала праўленне Галіена (253–268 гг. н.э., падчас фактычнага распаду Імперыі), калі ўтрыманне срэбра ў дэнары было скарочана да 10 працэнтаў, а затым да 3 працэнтаў ці нават меншай колькасці каштоўнага металу. Гэта сітуацыя пакінула след у выглядзе знаходак нізкаякаснай манеты, сярод якіх часам трапляюцца манеты розных рымскіх узурпатараў, якіх налічвалася некалькі дзясяткаў. Спробы палепшыць сітуацыю пачаў Дыёклетыян, чые рэформы ў 294–296 гг. н.э. былі накіраваны на аднаўленне агульнай цыркуляцыі манет высокай якасці. У гэты перыяд пачаўся новы ўздым у гандлі з імперыяй, які працягнуўся падчас праўлення Канстанціна I і яго сыноў. Гэты перыяд доўжыўся каля 50 гадоў (310–360 гг.) [6, с. 27]. Але памеры прытоку грошай былі непараўнальна менш, чым у II ст.

Эскалацыя крызісу Імперыі паклала канец супердзяржавы і прывяла да разбурэння рымскага грамадства. Нашэсце гунаў і Вялікае перасяленне народаў прывялі да разбурэння Заходняй Рымскай імперыі ў V ст. Цяжкасці ў падтрыманні існуючых гандлёвых шляхоў у спалучэнні з націскам варвараў амаль цалкам блакавалі прыток рымскіх манет. Кантакты з Усходняй імперыяй працягваліся ў V ст., якім датуецца вялікая частка скарбаў [3, с. 122].

Канцом VI ст. варта датаваць знікненне прытоку рымскіх грошай на землі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, хоць асобныя манеты маглі дасягаць акрэсленых земляў у першай палове VII ст. Да пачатку IX ст. мы не маем знаходак грашовых адзінак.

Такім чынам, магчыма вылучыць некалькі перыядаў рымскай гісторыі часоў Імперыі:

– перыд кіравання дынастыі Юліяў-Клаўдзіяў, калі адбылося закладанне рымскай імперскай фінансава-палітычнай сістэмы;
– перыяд кіравання Флавіяў;
– перыяд кіравання "пяці добрых імператараў";
– перыяд канца III – пачатку IV ст.

У дадзеныя перыяды назіраўся ўздым палітычнай і фінансавай магутнасці Рымскай імперыі, што адбівалася і на тэрыторыях, якія не ўваходзілі ў яе склад. У перыяды ж канца II – III ст., а таксама з канца IV назіраецца заняпад, які характарызуецца змяншэннем, а потым і наогул знікненнем знаходак і іх слядоў. Магчыма сказаць, што гісторыя Рыма стала не толькі гісторыяй тых частак Еўропы, якія ўваходзілі ў яго склад, але і наогул усёй Еўропы.

**Літаратура:**

1. Археалагічныя калекцыі. Жалезны век: музейны каталог / В.М. Сідаровіч ; Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск : Выдавец Анікеенка, 1999. – 48 с.
2. Баран, В.Д. Черняхівска культура – поліетнічне утворення на території Південно-Східної Европи / В.Д. Баран // Археологія древніх слов'ян: дослідження і матеріали / Ин-т Археології НАН України, рэдкал.: Д.Н. Козак (гал. рэд.) [та інш.]. – Київ, 2004. – С. 93–102.
3. Кропоткин, В. В. Клады римских монет в Восточной Европе // Вестн. древ. истории. – 1951. – № 4. – С. 243–281.
4. Andrzejowski, J. Wschodnia strefa kultury przeworskiej – próba defenicji / J. Andrzejowski // Wiadomości Archeol. – Warszwa, 2001. – T. LIV. – S. 59–87. Andrzejowski, J. Przemiany osadnicze i kulturowe na wschodnim Mazowszu i południowym Podlasiu u schyłku starożytności / J. Andrzejowski // Najstarsze dzieje Podlasia w świetle źródeł archeologicznych: praca zbiorowa / Akad. Podlaska, Inst. Historii, Siedleckie; pod red. B. Brzyńczak, P. Urbańczyk. – Siedlce, 2001. – S. 96–136.
5. Andrzejowski, J. Wykaz stanowisk z okresu rzymskiego / J. Andrzejowski // Zabytki z okresu wpływów rzymskich, średniowiecza i czasów nowożytnych z Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie / J. Andrzejowski [et al.]; pod red. A. Piotrowskiego; Państwowe Muzeum Archeol. w Warszawie, Ośrodek Ochrony Dziedzictwa Archeol. – Warszawa, 2005. – S. 17–31.
6. Dąbrowska, T. Stan i problemy badań nad młodszym okresem przedrzymskim i okresem wpływów rzymskich na Mszowszu / T. Dąbrowska, T. Liana // Stan i potrzeby badań nad młodszym okresem przedrzymskim i okresem wpływów rzymskich w Polsce: [materiały z konf., Kraków, 14–16 listopad 1984 r. / Uniw. Jagielloński, Inst. Archeologii; [red. nauk.: K. Godłowski, R. Madyda-Legutko]. – Kraków, 1986. – S. 147–166.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова